WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

28 КРАСАВІКА 2011 г.
ЧАЦВЕР
№ 79 (26943)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАКІРАВАЎСЯ З АФІЦЫЙНЫМ ВІЗІТАМ У ТУРКМЕНІСТАН

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з афіцыйным візітам у Туркменістан.**

Як чакаецца, кіраўнікі дзвюх дзяржаў у Ашхабадзе правядуць перагаворы ў вузкім і пашыраным складах. У цэнтры ўвагі будуць знаходзіцца пытанні развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж краінамі, рэалізацыя буйных сумесных праектаў.

Па выніках 2010 года Туркменістан займае восьмае месца ў аб'ёме знешняга гандлю Беларусі з краінамі СНД і сёмае ў аб'ёме экспарту ў гэтыя краіны. Тавараабарот паміж Беларуссю і Туркменістанам за апошнія пяць гадоў вырас у два разы, што абумоўлена высокімі тэмпамі росту беларускага экспарту, аб'ёмы якога значна перасягаюць імпарт. Двухбаковы гандаль характарызуецца для Беларусі ўстойліва дадатным сальда. Па выніках 2010 года аб'ём двухбаковага гандлю склаў $90,7 млн і павялічыўся ў параўнанні з 2009 годам на 21,1 працэнта. Экспарт вырас на 19,3 працэнта і складае $87,2 млн. Дадатнае сальда склала каля $83,6 млн.

У студзені-лютым 2011 года аб'ём двухбаковага гандлю склаў $16 млн і павялічыўся ў параўнанні з адпаведным перыядам 2010 года ў 3,1 раза. Экспарт вырас у 3,2 раза і перавысіў $15 млн. Беларусь экспартуе ў Туркменістан пераважна тавары з высокай дабаўленай вартасцю: трактары, дарожную тэхніку, машыны для апрацоўкі глебы, грузавыя аўтамабілі, шыны, прадукцыю дрэваапрацоўчай прамысловасці, лекавыя прэпараты, прадукты харчавання. Аснову імпарту з Туркменістана складаюць баваўняная пража і валакно, шэрсць нячэсаная, пасцельная бялізна.

Беларусь і Туркменістан рэалізуюць буйны праект на агульную суму больш як $1 млрд па стварэнні горна-абагачальнага камбіната па выпуску калійных угнаенняў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

«Прамая лінія»

## ПРАЦОЎНЫЯ ПРАВЫ, ЖЫЛЛЁВЫЯ ПЫТАННІ

Кантракты, працоўны і сацыяльны водпуск, працягласць працоўнага дня, асаблівасці працы моладзі, жанчын і інвалідаў, а таксама магчымыя варыянты вырашэння традыцыйна няпростага «жыллёвага пытання» — усё гэта стане тэмамі «прамой лініі» нашай газеты з удзелам намесніка загадчыка юрыдычнай кансультацыяй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Святланы Васільеўны КОТАВАЙ і галоўнага спецыяліста юркансультацыі ФПБ Васіля Мікалаевіча КОРСУКА.

Такім чынам, увага! **«Прамая лінія» пройдзе 29 красавіка з 11 да 12 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах **(8-017) 292 38 92 і 292 38 21**. **Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57**.

## СВЯТОЧНЫ ГРАФІК БАЛЬНІЦ І ПАЛІКЛІНІК

**Загадам Міністэрства аховы здароўя зацверджаны графік работы арганізацый аховы здароўя ў выхадныя і святочныя дні ў красавіку—маі 2011 года.**

Як паведамілі журналісту «Звязды» ў прэс-службе галоўнага медыцынскага ведамства, **30 красавіка і 14 мая бальнічныя і амбулаторна-паліклінічныя арганізацыі будуць працаваць па графіку работы ў суботні дзень, 1 і 3 мая — па графіку святочнага дня і 2 мая — па графіку працоўнага дня**.

Згодна з загадам, у выхадныя і святочныя дні прадпісваецца ўзмацніць работу прыёмных аддзяленняў бальніц, траўматалагічных пунктаў, аддзяленняў інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыі высокакваліфікаванымі спецыялістамі, забяспечыць бесперабойную работу службаў жыццезабеспячэння арганізацый аховы здароўя, а таксама забяспечыць адміністратыўныя дзяжурствы ва ўпраўленнях аховы здароўя аблвыканкамаў, Камітэце па ахове здароўя Мінгарвыканкама, у падведамасных арганізацыях і дома з кола кіруючага саставу (галоўны ўрач, дырэктар, намеснікі). Нагадаем, што згодна з Пастановай Савета Міністраў №232 ад 24 лютага 2011 года працоўны дзень з панядзелка 2 мая пераносіцца на суботу 14 мая.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ДАПАМОГ...

**Тры машыны пашкодзіў у Гродне хлопец, які... ніколі не атрымліваў вадзіцельскага пасведчання, паведамляе абласная Дзяржаўтаінспекцыя.**

Гэта здарылася на пляцоўцы, дзе супрацоўнікі ДАІ праводзяць агляд транспартных сродкаў пры іх пастаноўцы альбо зняцці з уліку. Маладая жанчына збіралася паставіць на ўлік аўтамабіль «Форд» і пайшла афармляць дакументы, а брата папрасіла, калі спатрэбіцца, праехаць уперад. Здавалася б, дробязь, але... Праз паўгадзіны малады чалавек патэлефанаваў ёй і паведаміў, што пашкодзіў тры машыны — «Сітраен», «Фальксваген» і «Опель». Прычым пратакол складзены не толькі на яго, але і на сястру, якая перадала аўтамабіль асобе, што не мае законнага права на кіраванне ім.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## «БУДЗЕМ ЖЫЦЬ!»

...Спявалі беларускія зоркі ў сталічным атэлі «Краўн Плаза» 26 красавіка — у Дзень памяці чарнобыльскай трагедыі. Спявалі для анкалагічна хворых дзяцей. Гэта была вельмі важная дабрачынная акцыя ў падтрымку маленькіх жыхароў, якія аказаліся ў страшэннай бядзе.

СТАР. 3

«Прамая лінія»

## ЛЕЧЫМ ДЗЯЦЕЙ ПРАВІЛЬНА

Прафілактыка, дыягностыка і лячэнне хвароб нырак і мочавыводзячых шляхоў у дзяцей — тэма нашай чарговай «прамой лініі», падчас якой на вашы пытанні адкажа член-карэспандэнт НАН Беларусі, Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчык 1-й кафедры дзіцячых хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Аляксандр Васільевіч СУКАЛА.

«Прамая лінія» адбудзецца **6 мая, у пятніцу, з 14.00 да 15.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21**. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: **8 (017) 287 18 29 і 287 18 36**.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Стройкомплект» (продавец)**
проводит открытый аукцион по продаже **здания склада нестандартного оборудования** (инв. № 644/С-35022), об. пл. 858 кв.м, расположенного по адресу: **Минская область, Солигорский район, Любанское шоссе, 16.**

**Начальная цена с НДС – 465 003 048 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,2331 га.**

**Задаток в сумме 40 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Объект обременен договором аренды (действует по 31.12.2012).**

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **31.05.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.05.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.**

Пытальнік

## КАЛІ ПРЫ СКАРАЧЭННІ — ПЕНСІЯ РАНЕЙ?

*Ужо пяць гадоў не працую і не знаходжуся на ўліку ў службе занятасці, бо там прапануюць толькі цяжкую фізічную працу, а выконваць яе з прычыны кепскага здароўя я не магу. А пытанні наступныя. Куды і калі трэба звяртацца па пенсію пасля дасягнення 60-гадовага ўзросту? Што рабіць, калі не захаваўся вайсковы білет? І чаму нельга пайсці на пенсію ў 55 гадоў мужчыне, які мае поўны стаж для яе прызначэння і які стаў беспрацоўным у выніку скарачэння?*

**Раман М.**, *г. Гомель*

Як заўважыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ларыса ЯШКОВА**, у выпадку, калі чалавек не працуе, звяртацца па прызначэнне пенсіі неабходна ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Прычым пажадана звярнуцца загадзя — прыкладна за месяц да дасягнення пенсійнага ўзросту.

Па-другое. Паколькі тэрміновая служба сапраўды залічваецца ў стаж, то час знаходжання ў арміі неабходна пацвердзіць. І калі вайсковы білет не захаваўся, то неабходна запытаць у ваенкамаце даведку аб перыядзе праходжання вайсковай службы.

І нарэшце. Як адзначыла Ларыса Яшкова, заканадаўства дае права на зніжэнне агульнавызначанага пенсійнага ўзросту на 5 ці нават на 10 гадоў толькі ў некаторых выпадках — скажам, за працу ў шкодных, небяспечных ці асаблівых умовах. Што ж да асоб, якія трапілі пад скарачэнне штату, то тут ёсць варыянт змяншэння агульнавызначанага пенсійнага ўзросту на год. Але пры пэўных умовах: жанчыне неабходна мець стаж не менш за 33, а мужчыне — не менш за 38 гадоў, а плюс да таго служба занятасці павінна пацвердзіць, што чалавека, які трапіў пад скарачэнне, немагчыма працаўладкаваць.

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.04.2011 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 3 033,00 | 1 чэшская крона | 184,68 |
| ▲ 1 еўра | 4 446,98 | 1 польскі злоты | 1 130,22 |
| 1 латвійскі лат | 6 277,55 | 1 расійскі рубель | 109,15 |
| 1 літоўскі літ | 1 289,60 | 1 украінская грыўня | 380,55 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 27,7144 |
| 10 UAH | 34,7734 |
| 10000 BYR | 90,9862 |
| EUR | 40,6681 |

Летапіс энергетыкі Беларусі



## ААТ «Электрацэнтрмантаж»: УВЕСЬ КОМПЛЕКС РАБОТ — НА СУСВЕТНЫМ УЗРОЎНІ

**Кожны з нас, людзей, сам па сабе ўнікальны. Але калі прыглядзецца больш уважліва, паназіраць хоць бы крыху, а лепш прааналізаваць, дык высветліцца, што сваю адметнасць, нават можна сказаць — характар, мае і любое прадпрыемства. Тут ужо не само па сабе, вядома ж, а як працяг пэўных жыццёвых і прафесійных прынцыпаў, стаўлення да працы падначаленых, найперш яго кіраўніка. І яшчэ — каманды, якую ён сфарміраваў і скіраваў на дасягненне пэўных вынікаў. Каб было больш зразумелым, патлумачым гэтыя словы. Ёсць, умоўна кажучы, кіраўнік, менеджар. Выдатны спецыяліст, прафесіянал, але — толькі кіраўнік, наёмны работнік, калі карацей, чыя ініцыятыва хоць і вітаецца, але ўсё ж абмежаваная загадамі «зверху». І прадпрыемства, арганізацыя, якую ён узначальвае, з'яўляецца такім жа вялікім выканаўцам важнай і патрэбнай работы. А ёсць гаспадар, які не толькі выконвае ўсю тую ж належную працу, але і яшчэ і сам прымае рашэнні, а значыць, нясе адказнасць — перад сабой, іншымі. Адказнасць больш глыбокую і сур'ёзную, паколькі ад рызыкоўных фактараў ніхто не застрахаваны. Таму ўсё трэба пралічваць, але калі прыняў рашэнне — дзейнічаць. А цяпер уявіце не чалавека, а прадпрыемства-гаспадара. Творчай брыгадзе «Звязды» выпала нагода пазнаёміцца і з асобай, і з юрыдычнай асобай (даруйце за невялікі каламбур), якіх павязвае і аб'ядноўвае, з якіх вынікае і залежыць адзін ад аднаго гэтае паняцце — гаспадар. Такім адкрыццём стала для нас ААТ «Электрацэнтрмантаж», яго кіраўнік Генадзь Мікалаевіч ВЯЛІТЧАНКА і ўвесь падначалены яму калектыў. На працягу ўсяго нашага знаёмства і з самім прадпрыемствам, і з калектывам нам потым неаднойчы даводзілася сутыкацца з гэтым — гаспадарскім — падыходам да спраў. Магчыма, нехта з чытачоў заўважыў у вышэйвыкладзеным залішнюю патэтыку? Што ж, мяркуйце самі: сёння мы раскажам пра складнікі поспеху гэтага прадпрыемства. У чым яны? Пра што можна гаварыць?**

ISSN 1990 - 763X



Калектыў ААТ «Электрацэнтрмантаж» мае дзелавыя сувязі з многімі краінамі.

### ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Генадзь Мікалаевіч Вялітчанка нарадзіўся ў 1963 годзе ў г. Светлагорску Гомельскай вобласці. Адукацыя вышэйшая: Беларускі політэхнічны інстытут (1985 год), інжынер-электрык, «Электрычныя станцыі»; Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (2002 год), «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемствах».

Інжынер, майстар (1985—1991 гады), прараб Мантажнага ўпраўлення № 8 трэста «Электрацэнтрмантаж», арэнднага прадпрыемства, прадпрыемства калектыўнай уласнасці «Электрацэнтрмантаж» (1991—1999 гады), старшы прараб — начальнік прадпрыемства калектыўнай уласнасці, адкрытага акцыянернага таварыства «Электрацэнтрмантаж» (1999—2000 гады), намеснік дырэктара па вытворчасці ААТ «Электрацэнтрмантаж» (2000—2005 гады), дырэктар прадпрыемства (па цяперашні час).

Гэта — сухія радкі з біяграфіі. Яны важныя. Але хіба могуць яны ў поўнай меры ахарактарызаваць чалавека? Наўрад ці. Таму дазволім да вышэйвыкладзенага дадаць літаральна некалькі штрыхоў. Генадзь Мікалаевіч — чалавек слова. Што паабяцаў, тое зрабіў. У дзень нашай камандзіроўкі на прадпрыемства ён прыняў творчую брыгаду «Звязды», як і дамаўляліся, знайшоў час для размовы. Хоць перад гэтым у яго кабінеце праходзіла планёрка, а практычна адразу потым Генадзь Мікалаевіч павінен быў ехаць у камандзіроўку. Калі пазней мы размаўлялі з работнікамі прадпрыемства рознага ўзроўню, увесь час чулі: «Калі дырэктар паабяцаў, сваё слова выканае», або «Кіраўнік выслухаў і прыняў нашы прапановы». Здзіўленне і павагу ў нас выклікаў і наступны факт. У нашым неспакойным свеце здараецца рознае, у тым ліку і затрымкі з плацяжамі. Здараецца, што і прадпрыемству несвоечасова пералічваюць грошы. А вось яно само — гэта якраз пра прынцыповую пазіцыю Генадзя Мікалаевіча — заўсёды свае абавязацельствы выконвае: паколькі павінны — значыць, трэба сродкі знайсці і адразу заплаціць.







Слесары Сяргей КАВАЛЕЎСКІ і Ягор ЛІТВІНКОВІЧ рыхтуюць камеру для парашковага напылення.

### ПРА ТОЕ, ШТО БЫЛО І ШТО ЁСЦЬ

Адкрытае акцыянернае таварыства «Электрацэнтрмантаж» вядзе адлік сваёй гісторыі з 1 ліпеня 1962 года, калі было заснавана Мантажнае ўпраўленне №8 (МУ-8) трэста «Электрацэнтрмантаж». 30 снежня 1992 года Мантажнае ўпраўленне №8 трэста было пераўтворана ў арэнднае прадпрыемства «Электрацэнтрмантаж». 7 верасня 1994 года арэнднае прадпрыемства стала прадпрыемствам калектыўнай уласнасці «Электрацэнтрмантаж». 15 кастрычніка 1999 года яно было пераўтворана ў адкрытае акцыянернае таварыства «Электрацэнтрмантаж».

Сёння адкрытае акцыянернае прадпрыемства «Электрацэнтрмантаж» — прадпрыемства энергетычнай прамысловасці Рэспублікі Беларусь. Няма ніводнага колькі-небудзь значнага аб'екта ў краіне, дзе б ААТ «Электрацэнтрмантаж» не выконвала б электрамантажныя работы: на Бярозаўскай і Лукомльскай ГРЭС, Наваполацкай, Светлагорскай, Гомельскай і Мазырскай ЦЭЦ, Магілёўскай і Гродзенскай ЦЭЦ-2, Мінскіх ЦЭЦ.

У сувязі з развіццём энергетыкі ў Беларусі, у апошнія гады ўведзены ў дзеянне новыя магутнасці цеплавых электрастанцый. Істотна павялічваюцца аб'ёмы рэканструкцыі буйнейшых энергетычных аб'ектаў з укараненнем аўтаматычных сістэм кіравання тэхналагічнымі працэсамі, дзе ўсе работы вядуцца пры ўдзеле ААТ «Электрацэнтрмантаж». Гэта і рэканструкцыя Мінскіх ЦЭЦ-3 і ЦЭЦ-4, дзе змантаравана самае сучаснае абсталяванне, і рэканструкцыя блокаў Бярозаўскай ГРЭС, сеткавых аб'ектаў 35-750 кВ.

Спецыялістаў прадпрыемства добра ведаюць далёка за межамі нашай краіны. Яны ўдзельнічалі ў будаўніцтве энергетычных аб'ектаў Ірана, Ірака, Манголіі, Кубы, Анголы, Індыі, Грэцыі, Германіі, Кітая, Кіпра, Гвінеі і многіх іншых краін свету. У Расіі выконвалі работы на Курскай, Смаленскай, ва Украіне — Запарожскай і Ровенскай атамных станцыях.

ААТ «Электрацэнтрмантаж» выконвае работы не толькі на аб'ектах энергетыкі, але і на іншых аб'ектах. Так, напрыклад, выкананы ўвесь комплекс электрамантажных работ, а таксама работ па аўтаматычных сістэмах кіравання тэхналагічнымі працэсамі, наладцы з пастаўкай поўнага камплекту абсталявання ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, у сховішчы Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

СТАР. 4-5



Начальнік мантажнага падраздзялення Уладзімір РАЛЬКО з электрамантажнікамі Уладзімірам АСТАШОНКАМ, Антонам МАРЧАНКАМ, Яўгенам КЛІМЕНКАМ.



Складаныя электрамантажныя работы даручаны Галіне АФАНАСЬЕВАЙ і Ліліі АЛЯШЧУК.







# «БУДЗЕМ ЖЫЦЬ!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дабрачынная акцыя з такой жыццясцвярджальнай назвай прайшла ў дзень 25-й гадавіны чарнобыльскай катастрофы па ініцыятыве і падтрымцы сталічнага атэля «Краўн Плаза». Адбыўся больш чым трохгадзінны канцэрт зорак эстрады для асаблівай катэгорыі беларускіх дзетак — пацыентаў Рэспубліканскага дзіцячага анкалагічна-гематалагічнага цэнтра. А таксама для дзяцей чарнобыльскіх ліквідатараў і сацыяльна неабароненых.

— Мы хочам падтрымаць дзяцей у бядзе, даць ім надзею і падтрымаць іх сілы ў пераадоленні цяжкіх хвароб, — падзялілася Ірына Арыновіч — старшыня вядомай гуманітарнай асацыяцыі «Давер», якая таксама далучылася да арганізацыі прыгожага, вясёлага і вельмі важнага мерапрыемства.

Андрэй Хлястоў, Георгій Калдун і Альберт Скараход, гурты «Цвет алоэ», «Федэрацыя», «Світанак» і іншыя артысты пагадзіліся праспяваць для гэтых дзяцей, некаторыя з якіх прыехалі на свята (для іх гэта было сапраўднае свята) у марлевых павязках на тварах. У гэтыя хвіліны, адчувалася, што маленькія пацыенты анкалогіі забыліся пра свае пакуты. Для незвычайных гасцей прэстыжнага атэля быў падрыхтаваны багаты на вітаміны стол, смачны і карысны полудзень.

Асаблівасцю сустрэчы быў удзел і колішніх пацыентаў анкалогіі і гематалогіі, якія лячыліся і дзесяць, і пятнаццаць, і дваццаць гадоў таму і цалкам выздаравелі. Станоўчы прыклад вельмі важны. Маладыя мамы прывялі нават сваіх маленькіх дзетак.

Свет не без добрых людзей, і таму чарнобыльская праблема не забываецца, колькі б ні мінула дзесяцігоддзяў. Словы ўдзячнасці прамаўляліся і пасольству Італіі ў Беларусі, і сталічнаму клубу львоў «Лайнз клуб», якія таксама далучыліся да таго, каб акцыя «Будзем жыць» (на фотаздымках) адбылася.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

## Ну і ну!

### Праглынуў залаты бранзалет

**Злодзей скраў у гаспадара кватэры, у якога быў у гасцях, бранзалет. А потым, каб схаваць яго ад міліцыянераў... праглынуў. Толькі слабіцельнае дапамагло атрымаць доказ ягонай віны.**

Як паведаміла «Звяздзе» **старшы памочнік пракурора горада Віцебска Настасся КАЗЛОВА**, злодзей ужо асуджаны. Крымінальная гісторыя з даволі рэдкім канцом адбылася прыкладна так. Раней судзімы быў у гасцях. Прымалі яго вельмі гасцінна. Калі гаспадар заснуў, госць зняў з яго рукі залаты бранзалет. Потым яшчэ скраў з кішэняў вопраткі ў вітальні грошы: 200 долараў і столькі ж тысяч беларускіх рублёў. І спакойна пайшоў па сваіх справах.

Гаспадары заявілі ў міліцыю аб крадзяжы. Злодзея знайшлі. Чужыя грошы ён ужо патраціў. А каб пазбавіцца ад бранзалета, проста ўзяў і праглынуў. Маўляў, шукайце: не краў я ніякага бранзалета. Міліцыянеры западозрылі, што нельга яму верыць. Адвезлі ў кабінет рэнтгеналогіі.

Урач, бадай, толькі ў кіно такое мог убачыць. Насамрэч бранзалет быў вельмі добра бачны ўнутры чалавека, ды як яго дастаць? Прымянілі добры правераны дзесяцігоддзямі спосаб: далі злачынцу выпіць слабіцельнае. І...

Аматар чужых грошай і залатых вырабаў пазбаўлены волі на тры гады. У калоніі строгага рэжыму яго будуць лячыць і ад хранічнага алкагалізму.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Творцы-вучонаму
Ул.М. КІСЯЛЁВУ — 80!
Шчасця, здароўя, моцы!
**М. МАЛІНОЎСКІ.**

УНП 100023492

## ОАО «БЕЛНИИЛИТ»

*220118, г. Минск, ул. Машиностроителей, 28*

**ИНФОРМАЦИЯ**
**о результатах финансово-хозяйственной деятельности открытого акционерного общества «БЕЛНИИЛИТ» за 2010 год**

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период, млн. руб. | За аналогичный период прошлого года, млн. руб. |
|---|---|---|---|
| 1. Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 11636 | 9842 |
| 2. Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 718 | 763 |
| 3. Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 5744 | 4459 |
| 4. Валовая прибыль | 040 | 5174 | 4620 |
| 5. Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 070 | 1341 | 1325 |
| 6. Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | 120 | -16 | -15 |
| 7. Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | 160 | - 414 | -339 |
| 8. Прибыль (убыток) | 200 | 911 | 971 |
| 9. Чистая прибыль (убыток) | 300 | 319 | 326 |
| 10. Количество акционеров – всего – 51, в том числе: юридических лиц – 1, физических лиц – 50. | | | |

| 11. Информация о дивидендах и акциях: | | | |
|---|---|---|---|
| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн. руб. | 36,4 | 32,6 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 36 | 33 |
| Обеспеченность акции имуществом | тыс. руб. | 8,8 | 8,8 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | | - |
| 12. Информация о задолженности: | | | |
| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
| Просроченная дебиторская задолженность | млн. руб. | 153 | 117 |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн. руб. | - | - |
| 13. Среднесписочная численность работающих (человек) – 152. | | | |
| 14. Основной вид деятельности: разработка технологий и оборудования для литейного производства. | | | |

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2010 год**
**по состоянию на 01.01.2011 года**

| Наименование показателя | Код строки | На начало года, млн. руб. | На конец года, млн. руб. |
|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | |
| Внеоборотные активы | 190 | 9691 | 11145 |
| Оборотные активы | 290 | 5680 | 5377 |
| **Баланс** | **300** | **15371** | **16522** |
| **ПАССИВ** | | | |
| Капитал и резервы | 490 | 12048 | 14474 |
| Долгосрочные обязательства | 590 | - | - |
| Краткосрочные обязательства | 690 | 3323 | 2048 |
| **Баланс** | **700** | **15371** | **16522** |

**Директор** **А.П. Мельников**
**Главный бухгалтер** **Н.В. Ванзонок**

Мікалай ФЯСЬКОЎ:

Абітурыент—2011

# «Інфармацыйная ахова ў пунктах правядзення ЦТ будзе ўзмоцненая»

**У абітурыентаў, якія яшчэ не вызначыліся канчаткова з выбарам сваёй будучай прафесіі, застаюцца лічаныя дні, каб даць самім сабе адказ на пытанне, кім яны хочуць быць: «фізікамі» ці «лірыкамі», медыкамі ці эканамістамі, філолагамі ці эколагамі, юрыстамі ці педагогамі? Уся справа ў тым, што 4 мая ў нашай краіне распачнецца рэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, таму з «наборам» экзаменацыйных дысцыплін трэба тэрмінова вызначацца. З гэтай нагоды дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ сустрэўся з журналістамі, каб давесці да абітурыентаў інфармацыю, як у бягучым годзе будзе праходзіць рэгістрацыя на ЦТ...**

— Галоўнай адметнасцю гэтага года стане падключэнне абсалютна ўсіх пунктаў рэгістрацыі ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання да аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Агульнарэспубліканскі банк звестак удзельнікаў ЦТ», — расказаў Мікалай Фяськоў. — Самая важная перавага аўтаматызаванай сістэмы рэгістрацыі заключаецца для абітурыентаў у тым, што ім цяпер не прыйдзецца самастойна шукаць сабе свабоднае пасадачнае месца. Гэта задача кладзецца на рэгістратараў. Аб'яднаная база звестак дазваляе аператару ў пункце рэгістрацыі «бачыць» свабодныя месцы ва ўсіх пунктах тэсціравання не толькі ў межах аднаго горада ці вобласці, але і ў межах усёй краіны. Маладыя людзі нават могуць выказаць пажаданне кшталту «а знайдзіце мне, калі ласка, месца ў ВНУ бліжэй да дома». Аўтаматызаваная сістэма працуе па прынцыпе «аднаго акна»: абітурыент можа завітаць у пункт рэгістрацыі ў Мінску і аформіць сабе пропуск для праходжання ЦТ у Віцебску ці Магілёве, ці, наадварот, звярнуцца, скажам, у Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт і зарэгістравацца там для здачы аднаго тэста ў Мінску, другога — у Баранавічах, а трэцяга — у Пінску. Трэба патлумачыць, што сістэма працуе не праз інтэрнэт. З дапамогай «Белтэлекама» для пунктаў рэгістрацыі была арганізавана ізаляваная лакальная сетка. Кожны пункт рэгістрацыі мае сувязь толькі з цэнтральным серверам, размешчаным у цэнтры апрацоўкі звестак «Белтэлекама» — там, дзе размяшчаюць серверы ўсе арганізацыі, якія паважаюць сябе. Папярэджваю ваша пытанне: умяшацца звонку ў сістэму рэгістрацыі ніхто не можа, таксама як і рэгістратары не могуць ніяк умяшацца ў работу рэгістратараў з іншага пункта. Затое мы ў інстытуце можам падключыцца да любога пункта рэгістрацыі, каб атрымаць патрэбную нам інфармацыю ў рэжыме анлайн. Напрыклад, у аўтаматызаванай сістэме ёсць спецыяльны раздзел «Справаздачнасць», які замяняе цяпер усе папяровыя носьбіты.

Летась да аўтаматызаванай сістэмы было падключана 46 пунктаў рэгістрацыі, а ў гэтым годзе — усе 73. 12 і 13 красавіка разам з «Белтэлекамам» было праведзена пробнае тэсціраванне сістэмы, а з 25 красавіка аўтаматызаваная сістэма працуе ўжо на пастаяннай аснове.

Па словах Мікалая Фяськова, дзякуючы аўтаматызаванай сістэме летась такое паняцце, як чэргі ў пункт рэгістрацыі ў сталіцы практычна знікла. Справа ў тым, што на ўнясенне ў сістэму ўсёй інфармацыі аб абітурыенце і афармленне пропуска ідзе, як правіла, не больш за 5 хвілін. Да таго ж, паколькі аператар запаўняе бланкі ў электронным варыянце, гэта выключае памылкі пры запаўненні бланка самім абітурыентам. Прычым праграма тут жа паведаміць пра допушчаную памылку, калі, напрыклад, аператар выпадкова набярэ няправільную колькасць сімвалаў у нумары пашпарта ці прапусціць нейкую графу. І нават калі абітурыент па дарозе згубіць свае пропускі, ён зможа завітаць у любы пункт рэгістрацыі са сваім пашпартам, прычым у любым горадзе, каб атрымаць іх дублікат: аднаўленне і раздрукоўка новых пропускаў зоймуць у апаратара лічаныя секунды.

Як сведчыць практыка папярэдніх гадоў, звычайна для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання рэгіструюцца ў нашай краіне ад 174 да 176 тысяч чалавек. Прыкладна палову ад агульнай колькасці абітурыентаў складаюць выпускнікі бягучага года. Аднак сёлета колькасць удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання можа скараціцца прыкладна на 15-20 тысяч чалавек.

— Але гэта толькі наш прагноз, заснаваны на змяншэнні колькасці вучняў выпускных класаў, — патлумачыў Мікалай Фяськоў. — Аднак ёсць яшчэ і выпускнікі папярэдніх гадоў, выпускнікі прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія таксама будуць «штурмаваць» вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Хачу падзяліцца адным нашым назіраннем — **выпускнікі бягучага года, як правіла, атрымліваюць больш высокія балы на ЦТ, чым выпускнікі папярэдніх гадоў, нават калі тыя і займаліся па некалькі разоў на тыдзень з рэпетытарам. Ужо праз год пасля заканчэння школы ўзровень ведаў у прэтэндэнтаў на студэнцкі білет заўважна зніжаецца, а праз два-тры гады — зніжаецца яшчэ больш.** У абітурыентаў з больш моцнай падрыхтоўкай часцей за ўсё балы, атрыманыя на рэпетыцыйным тэсціраванні і на ЦТ, адрозніваюцца неістотна. Вынік ЦТ можа быць у іх крыху горшы, чым падчас «пробнага» тэсціравання. Усё ж такі цэнтралізаванае тэсціраванне — не «рэпетыцыя». Узровень адказнасці — намнога вышэйшы, эмацыянальнае і нервовае напружанне — максімальнае. А вось у «слабых» абітурыентаў гэтая розніца больш выразная.

Заўважана таксама, што ў апошнія гады вылічальныя навыкі ў абітурыентаў працягвалі зніжацца. Праўда, гэтая тэндэнцыя характэрная не толькі для нас, але і для Украіны, Расіі, Казахстана, Галандыі. Калі ў Галандыі вынікі 18-гадовых першакурснікаў параўналі з вынікамі 12-гадовых школьнікаў, то высветлілася, што апошнія ведаюць матэматыку лепш, чым студэнты першага курса педагагічных факультэтаў. Зрэшты, тое ж тычыцца і ведання роднай мовы. Прыкладна палова галандскіх першакурснікаў педагагічных факультэтаў не змаглі паспяхова выканаць прапанаваныя тэсты.

Галандцы, як і мы, знаходзяцца ў разгубленасці. Не выключана, што ўсім нам даводзіцца сёння пажынаць плады цывілізацыі: камп'ютарныя тэхналогіі, безумоўна, значна спрашчаюць наша жыццё, пры гэтым мы не можам здзейсніць без калькулятара нават самыя элементарныя арыфметычныя вылічэнні. Набіраем тэксты на камп'ютары з памылкамі, упэўненыя, што тэкставы рэдактар выправіць нашу непісьменнасць. Нізкая культура мовы абітурыентаў асабліва кідаецца ў вочы на тэсціраванні па фізіцы і матэматыцы, бо заданні там сфармуляваныя максімальна лаканічна. Аднак найбольшая колькасць памылак заўсёды выяўляецца менавіта ў тэкставых задачах, напэўна таму, што абітурыенты проста не разумеюць, пра што ў іх пытаюцца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне ў наступным нумары.)*

## Выказванні прадстаўніка АБСЕ па свабодзе СМІ маюць заказны характар

**Выказванні прадстаўніка АБСЕ па свабодзе СМІ Дуні Міятавіч наконт уключэння беларускіх журналістаў у спісы неўязных у краіны ЕС маюць заказны характар і навязаны чыноўнікамі Еўрасаюза і ЗША. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА заявіў адказны сакратар Беларускага саюза журналістаў Вадзім Гігін, каментуючы адказ Дуні Міятавіч на зварот БСЖ з патрабаваннем аднавіць правы прадстаўнікоў беларускіх масмедыя, адносна якіх прыняты санкцыі з боку ЕС.**

Вадзім Гігін адзначыў, што пазіцыя пані Міятавіч яго ніколькі не здзівіла, іншых выказванняў ад яе ён не чакаў. «Вопыт адносін з еўрапейскімі чыноўнікамі паказвае, што яны агучваюць практычна адны і тыя ж завучаныя каноны, як некалі ў горшых традыцыях марксізму-ленінізму застойных часоў. Яны завучылі пэўныя фразы і з некаторай перыядычнасцю іх паўтараюць, не прымяраючы да сітуацыі». Паводле яго слоў, «заўсёды цікава выслухоўваць навучанні ад прадстаўнікоў неафіцкіх краін у заходняй супольнасці», у прыватнасці ад Дуні Міятавіч, якая прадстаўляе Боснію і Герцагавіну. «Вядома, у Босніі і Герцагавіне ўсё ў парадку са свабодай прэсы, з журналістыкай. Боснія і Герцагавіна з'яўляецца ўзорам дэмакратыі, міжнацыянальных адносін», — іранічна адзначыў Вадзім Гігін, дадаўшы, што спробы прадстаўнікоў такіх краін нас павучаць выглядаюць забаўна. Журналіст перакананы, што эксперт АБСЕ па свабодзе СМІ зусім не свабодна ў сваіх выказваннях: яна «чалавек паднявольны» і «выступае рупарам рашэнняў, прынятых у вялікіх еўрапейскіх сталіцах і Вашынгтоне». «Пасля таго, як НАТА разбамбіла яе родную краіну, яна адчувае вялікі страх перад заходняй супольнасцю, з'яўляецца, з аднаго боку, глыбока напалоханым чалавекам, з іншага боку — знаходзіцца на ўтрыманні гэтай супольнасці, і ніякіх іншых заяў, акрамя прынятых ёю, яна агучыць не можа», — лічыць Вадзім Гігін. Яго таксама здзіўляе, што прадстаўніца «такой супердэмакратычнай краіны, як Боснія і Герцагавіна», бярэ на сябе паўнамоцтвы падзяляць журналістаў у Беларусі на «сумленных» і «несумленных».

У сваім пісьме Міятавіч таксама спасылаецца на адсутнасць прафесійных інтарэсаў у «неўязных» журналістаў у краінах ЕС, адзначае, што яны займаюць пасады кіраўнікоў і пазбаўленне іх магчымасці трапіць у ЕС нібыта не мае дачынення да парушэння свабоды СМІ.

Вадзім Гігін назваў такія выказванні «адкрытай фальсіфікацыяй, паколькі значная частка тых, хто ўключаны ў спіс, не займаюць кіруючыя пасады ў сваіх СМІ». «Або Дуня Міятавіч не ведае сітуацыі ў Беларусі, або яна яе фальсіфікуе, або карыстаецца недакладнай інфармацыяй, якая прадастаўляецца глыбока ангажаванымі людзьмі». «А што, калі людзі з'яўляюцца кіраўнікамі СМІ, супраць іх можна прымяняць санкцыі? Няўжо Еўрапейская хартыя свабоды прэсы падзяляе журналістаў на кіраўнікоў СМІ і выканаўцаў? Там няма такога падраздзялення», — падкрэсліў Вадзім Гігін. На яго думку, пані Міятавіч кіруецца парадамі «пятай калоны, якая дзейнічае ў Беларусі і спрабуе настроіць заходнюю супольнасць (зусім не сусветную супольнасць, як яны падаюць) супраць Беларусі, супраць тых людзей, якія выказваюць адрозны ад іх пункт гледжання».

**Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:**

- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 0912658, 0776067, 0808213, 0808216, 0808217, 0896313, 0900043, 0900044, 0906457, 0911620, 0914501, 0914588, 0914589, 0813650, 0813656, 0813716, 0829121, 0829203, 0829242, 0829245-0829252, 0829266, 0829270, 0829293, 0849204, 0854390, 0854394, 0742066, 0786233, 0788667, 0798209, 0798291, 0907222, 0907233, 0911783, 0911914, 0911989, 0768284-0768289, 0894839, 0895001, 0895206, 0899337, 0713650, 0903771, 0903772, 0799050, 0837966, 0934117, 0934253, 0957781;
- квитанции 1 СУ серия КС №№ 0916294, 0276941, 0280537, 0288384, 0292691;
- добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско) 2РН, 2РП серия АК №№ 0012343, 0021061;
- добровольное страхование строений; добровольное страхование домашнего имущества ф.2РН серия БИ №№ 0381369, 0373229;
- добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир. Ф.2РН серия БИ №№ 0000946, 0000954.

УНП 100361187

**ЗАО «РРБ-БАНК» СООБЩАЕТ,**
что 26 апреля 2011 года Правлением ЗАО «РРБ-Банк»
(Протокол № 32 от 26.04.2011)
утверждены изменения № 5 в Правила организации обслуживания счетов клиентов Банка – юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, которые вступают в силу через пять банковских дней с момента публикации.

**Очередная отчетно-выборная конференция**
**ОО «Белорусская федерация танцевального спорта»**
состоится 05.06.2011 г. по адресу:
г. Минск, ул. Куйбышева, 79/2, гимназия № 30, актовый зал.
Начало в 10.00.

**Утерянный представителем Белгосстраха по Советскому району бланк квитанции** о приеме наличных денежных средств по обязательному страхованию строений, принадлежащих гражданам, формы 1СУо серии КО № 0461939 считать недействительным. УНП 101883943

## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
## *12 мая 2011 г.* повторно проводит открытый аукцион
### по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Боровлянский с/с, д. Дроздово, участок № 83 | 623680602601000864 | 0,1497 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 435 360 | 98 000 000 | 9 800 000 |
| 2 | Горанский с/с, д. Новое Поле | 623681315101000213 | 0,1515 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 178 283 | 11 000 000 | 1 100 000 |
| 3 | Крупицкий с/с, д. Дубинки | 623683903101000051 | 0,1613 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 660 566 | 12 000 000 | 1 200 000 |
| 4 | Крупицкий с/с, д. Дубинки | 623683903101000052 | 0,1687 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 736 906 | 12 000 000 | 1 200 000 |
| 5 | Крупицкий с/с, д. Каралино | 623683905601000146 | 0,1535 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 719 951 | 9 000 000 | 900 000 |
| 6 | Луговослободской с/с, д. Дворец | 623684103101000078 | 0,1554 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 062 465 | 18 000 000 | 1 800 000 |
| 7 | Луговослободской с/с, д. Заречье | 623684105601000165 | 0,1158 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 041 385 | 11 000 000 | 1 100 000 |
| 8 | Луговослободской с/с, д. Ксаверово | 623684107601000087 | 0,2302 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 620 311 | 23 000 000 | 2 300 000 |
| 9 | Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи, ул. Зеленая | 623655000001000603 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 052 290 | 63 000 000 | 6 300 000 |
| 10 | Папернянский с/с, д. Лапоровичи | 623685505101000331 | 0,2063 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 235 513 | 37 000 000 | 3 700 000 |
| 11 | Сеницкий с/с, а/г Прилуки | 623686604601000337 | 0,1300 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 445 310 | 23 000 000 | 2 300 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: 12.05.2011 г. в 9:00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 05.05.2011 г. Контактный телефон: 204-11-62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На Лот 2 перечисляется на расчетный счет № 3600621020043 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 3-5 перечисляется на расчетный счет № 3600621050071 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На Лоты 6-8 перечисляется на расчетный счет № 3600621070093 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600219251, код платежа – 04901.

На Лот 9 перечисляется на расчетный счет № 3600621080100 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600452694, код платежа – 04901.

На Лот 10 перечисляется на расчетный счет № 3600621120145 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

На Лот 11 перечисляется на расчетный счет № 3600621160189 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052409, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
2. заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет;
3. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
3.1. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

# ТУРЫСТЫЧНЫ СЕЗОН-2011: ЯК ЗНАЙСЦІ ВАЛЮТУ?

**Чакаецца, што летні турыстычны сезон-2011 будзе нядрэнным, заявіў на прэс-канферэнцыі дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Вадзім КАРМАЗІН. Падзеі ў Егіпце выключылі са спісаў адну з любімых беларусамі ў міжсезонне краін, услед за гэтым падзеі на валютным рынку паставілі на мяжу выжывання турыстычныя фірмы і пад пагрозу адпачынак за мяжой для многіх суайчыннікаў. Нягледзячы на гэта, у міністэрстве спадзяюцца на выкананне прагнозных паказчыкаў.**

Турысцкае прыбыццё ў нашу краіну на канец 2010 года склала 3,9 мільёна чалавек. На канец 2011 года плануецца дасягнуць лічбы ў 4,5 мільёна, г.зн. дасягнуць росту на 12 адсоткаў, паведаміў Вадзім Кармазін.

— Экспарт турпаслуг з'яўляецца сёлета ў нас прыярытэтным паказчыкам. Да 2015 года трэба дасягнуць павелічэння ў 4,5 раза. Сёлета рост павінен скласці 20 адсоткаў. Да канца года нам трэба зарабіць 175 мільёнаў долараў.

Калі меркаваць па лічбах у першым квартале, то крызісныя з'явы, якія былі ў 2009 годзе, з турыстычнай галіны сыходзяць, паведаміў Вадзім Кармазін. У першым квартале Беларусь наведала 850 тысяч турыстаў (на 70 тысяч больш, чым летась), выезд склаў 1 мільён 402 тысячы (рост — 120 адсоткаў). Экспарт турпаслуг за тры месяцы прынёс у казну 130 мільёнаў долараў (тэмп росту 140 адсоткаў).

Інфармацыю аб тым, што адпачынак у беларускіх санаторыях падаражэў і нашы бліжэйшыя суседзі адмаўляюцца да нас ехаць з-за неадэкватнага спалучэння цаны і якасці, міністэрства спорту не пацвярджае:

— Наадварот, тыя ж расіяне з задавальненнем да нас едуць. У нас адпачынак у санаторыях каштуе крыху ніжэй. І яны з разуменнем ставяцца да нашых павышальных каэфіцыентаў, — расказала **генеральны дырэктар турыстычнага прадпрыемства «Мінсктурыст» Марына МАСТАШОВА**.

— 90 адсоткаў месцаў у нашых санаторыях было прададзена ў сакавіку. І ў нас няма інфармацыі, што хтосьці адмовіўся ад пуцёвак, — пацвердзіў Вадзім Кармазін.

Марына Масташова паведаміла, што апошнім часам у многіх беларускіх санаторыях пуцёўкі выкупляюцца загадзя, прычым пераважна замежнымі грамадзянамі. І гэты перакос выпраўляецца: у прыватнасці, санаторыі «Белпрафсаюзкурорта» пэўную частку пуцёвак рэалізуюць толькі беларусам.

Як жа адчуваюць сябе турфірмы, якія сёлета адчулі «двайны ўдар»: спачатку забарона на паездкі ў Егіпет — самую запатрабаваную ў міжсезонне краіну, а цяпер і валютныя праблемы, якія закранулі іх так ці інакш?

— Турыстычны бізнэс — неад'емная частка эканомікі, і тыя праблемы, якія адчувае ўся эканоміка, адбіваюцца і на ім. У прыватнасці, гэта хістанні валютнага курса, — заўважыў **дырэктар Рэспубліканскага саюза турыстычных арганізацый Валянцін ЦЭХМЕЙСЦЕР**. — Я размаўляў са шматлікімі турыстычнымі кампаніямі, каб высветліць, як яны сябе адчуваюць. У лепшай сітуацыі тыя, хто мае ліцэнзію на працу з валютай, яны больш-менш працуюць. Хоць і там спад адчуваецца. Іншыя задаюць пытанне: дзе ў гэтым сезоне можна адпачыць за беларускія рублі і якія ў нас у гэтым сэнсе адносіны з найбліжэйшай суседкай — Украінай? Будзем спадзявацца, што гэта з'ява часовая, тым больш што ў СМІ з'яўляецца інфармацыя аб адпусканні на волю курса, у інтэрнэце шмат заяў аб лібералізацыі эканомікі. Хутчэй за ўсё, штосьці будзе зроблена і ў бліжэйшы час адбудзецца нейкая стабілізацыя.

— Мы падтрымліваем тыя турфірмы, якія займаюцца ўязным турызмам. І ў бліжэйшы час правядзём рэвізію, ці працуе адпаведны ўказ, які дае льготы на ўязны турызм. Што тычыцца выязнога турызму, то мне цяжка сказаць, ці трэба дзяржаве яго падтрымліваць, — пракаментаваў сітуацыю Вадзім Кармазін.

Курс долара, які на сёння ўстаноўлены ў большасці турфірмаў — 5500 рублёў. Беларусы па-ранейшаму выбіраюць Турцыю, Балгарыю і Грэцыю ў якасці краін для летняга адпачынку. У Егіпет ехаць не рэкамендуецца, аднак калі хтосьці настойвае, яму прадаюць тур. Многія турфірмы выйшлі ў плюс у першым квартале дзякуючы ранняму браніраванню. Але ў канцы красавіка яно завяршаецца:

— Нарэшце мы прывучылі беларусаў да ранняга браніравання. Апошнія гады ў студзені нашы замежныя калегі пыталіся, як продажы, і адказ быў: ніяк. Сёлета ўпершыню ў студзені мы выдатна прадавалі пуцёўкі: продажы павялічыліся на 50 адсоткаў, — расказаў прадстаўнік турфірмы «Аэрабелсэрвіс». — Ранняе браніраванне, якое ажыццяўлялася ў студзені-лютым, мы аплацілі, праблем з гэтым няма. Цяпер жа мы рэкамендуем кліентам разлічвацца валютай. Для тых, хто яе не мае, курс 5500.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# ААТ «ЭЛЕКТРАЦЭНТРМАНТАЖ»: УВЕСЬ КОМПЛЕКС РАБОТ –


Гэта складанае абсталяванне на Мінскай ЦЭЦ-5 устанаўліваюць электрамантажнікі, якімі кіруе брыгадзір Мікалай МЕРКУЛЬ.


Намеснік дырэктара Яўген МЯДЗВЕДСКІХ з электрамантажнікамі Сяргеем СЯРКО і Ігарам АГРЭНІЧАМ.


Зборкай схемы шафы кіравання занята электрамантажнік Галіна МАРОЗ.

## ПРА ПАЛІТЫКУ Ў ГАЛІНЕ ЯКАСЦІ

**На прадпрыемстве ААТ «Электрацэнтрмантаж» прайшло ўкараненне і дзейнічае сістэма менеджменту якасці, скіраваная на здольнасць прадпрыемства выконваць электрамантажныя работы, якія адпавядаюць патрабаванням і чаканням заказчыкаў, адпаведным абавязковым патрабаванням нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі, патрабаванням заканадаўчых актаў. Мэтай прадпрыемства з'яўляецца павышэнне задаволенасці спажыўца праз эфектыўнае выкарыстанне сістэмы, яе пастаяннае паляпшэнне і забеспячэнне адпаведнасці выкананых электрамантажных работ патрабаванням заказчыка (спажыўца) і абавязковым патрабаванням заканадаўчых і нарматыўных актаў.**

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

## ПРА САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ПРА ЛЮДЗЕЙ

— У чым складнік поспеху? У кадрах! — ні на секунду не задумваючыся, рашуча і адназначна адказвае на гэтае пытанне дырэктар Генадзь Мікалаевіч. — На сённяшні дзень такіх вопытных і кваліфікаваных кадраў — спецыялістаў па мантажы электраабсталявання і аўтаматычных сістэм кіравання — няма ў нас больш нідзе. Людзі — стрыжань нашага прадпрыемства!

Сёння на ААТ «Электрацэнтрмантаж» працуюць 700 чалавек. Гэта, вядома, нельга параўноўваць з 1 700 работнікамі, якія працавалі толькі на адным аб'екце Смаленскай АЭС. Там усе электрамантажныя работы на блоку №1 у 1981-1982 гадах былі выкананы сіламі прадпрыемства пад кіраўніцтвам, дарэчы, **Мікалая Паўлавіча ВЯЛІТЧАНКІ — бацькі цяперашняга дырэктара.** І ўсё ж гэта вялікі калектыў, і, што самае галоўнае, большасць з работнікаў — мантажнікі, наладчыкі, будаўнікі самай высокай кваліфікацыі. Яны здольныя выконваць увесь комплекс будаўнічых, электрамантажных работ: мантаж і наладку сістэм кантролю, аховы і кіравання электра- і цеплamеханічнага абсталявання, кабельных ліній электраперадач і трансфарматарных падстанцый, сістэм пажарнай аўтаматыкі і электраўстановак, дзе магчымае ўтварэнне выбуханебяспечнага асяроддзя, будаўніцтва будынкаў і збудаванняў. Тут толькі можна прыгадаць, што, напрыклад, у 2003 годзе колькасць калектыву была напалову менш, уласны інжынерна-тэхнічны персанал ІТР складаў усяго 58 чалавек, а рабочых быў 301 чалавек. Зараз жа ўласны інжынерна-тэхнічны персанал даўно перавысіў сотню спецыялістаў, а колькасць рабочых перавысіла пяць соцень. Пры тым, што кваліфікацыя апошніх (сярэдні разрад) і ў згаданы вышэй год, і зараз нязменна былі і засталіся высокімі — 4,4.

А Мікалай Паўлавіч Вялітчанка, які зараз працуе намеснікам па эканоміцы, потым падчас нашага далейшага знаёмства з прадпрыемствам нібыта ўскосна дапоўніў адказ дырэктара пра адзін з галоўных складнікаў поспеху ААТ. Дапоўніў простымі, але мудрымі словамі.

— Пасля распаду Савецкага Саюза мы ўжо 20 гадоў як на «вольных хлябах», у прадпрыемстве няма долі дзяржавы. Мы спецыяльна не сталі мяняць назву і з тых часоў узялі на ўзбраенне традыцыі, усё тое лепшае, што тады было. І ўвесь час імкнуліся іх захаваць, але, разам з тым, — і браць тое лепшае, што было з сусветных стандартаў. Пераймалі і ўкаранялі на нашым прадпрыемстве. Нарошчвалі цягам апошніх 15 гадоў свае, закладзеныя яшчэ пры Савецкім Саюзе, паказчыкі ў эканоміцы, тэхніцы, у рабоце з кадрамі.

Некалькі забягаючы наперад, адзначым, што такі падыход даў свой плён. Прынамсі, як распавёў Мікалай Паўлавіч, за прайшоўшыя гады ў эканоміцы прадпрыемства не было правалаў, затое ўвесь час ішло нарошчванне аб'ёмаў работ, ды і эканамічных паказчыкаў: рэнтабельнасці, прыбытковасці. Вялася праца, як ужо гаварылася, па павышэнні кваліфікацыі мантажнага персаналу, інжынерна-тэхнічных работнікаў. Напрыклад, рэнтабельнасць усе гэтыя гады складала ад 12 да 20 працэнтаў.

## ПРА КОМПЛЕКСНЫ ПАДЫХОД І КАНКУРЭНЦЫЮ

Другім момантам, другім па ліку складнікам поспеху дырэктар прадпрыемства назваў комплексныя падыходы ў вырашэнні задач. Што пад гэтым маецца на ўвазе?

— Працей за ўсё было б сказаць, што гэта генпадрад, што мы ідзём і на ўсіх конкурсах выступаем як генпадрадчыкі, пралічваючы ўсё — ад цэглы да наладкі сістэм аўтаматычнага кіравання. Але гэта не зусім так — гаварыць так было б спрашчэннем. Насамрэч усё нашмат больш сур'ёзна. У апошні час мы імкнёмся пазіцыянаваць сябе як EPC-кантракт. Іншымі словамі, да генпадраду дадаём яшчэ праектныя работы і камплектуючае абсталяванне. Так, як гэта заведзена ў сусветнай эканоміцы. У Беларусі ж першыя крокі ў гэтым накірунку толькі пачалі рабіцца летась. Аднак у сувязі з валютнымі праблемамі гісторыя не атрымала належнага развіцця. Больш за тое, яна развярнулася на 180 градусаў назад, і зараз мы ідзём не да цывілізаванага рынку, а ад яго. Але, па маім глыбокім перакананні, такая сітуацыя — часовая, жыццё прымусіць ісці нас тым шляхам, якім прайшла ўся супольнасць. І тыя напрацоўкі, якія мы зрабілі раней, якія робім зараз, не прападуць. Зазірнуўшы наперад гады на чатыры, на пяць, абсалютна перакананы ў тым, што гэтыя распрацоўкі спатрэбяцца, — гаворыць Генадзь Мікалаевіч.

### *Неабходная даведка*

*EPC — англійская абрэвіятура (паходзіць ад слоў «інжынірынг», «пастаўкі», «будаўніцтва»), пад якой маецца на ўвазе дагавор на будаўніцтва «пад ключ» з фіксаванай цаной. EPC-падрадчык — гэта генеральны падрадчык, які выконвае за цвёрдую цану асноўны аб'ём работ інвестыцыйна-будаўнічага праекта і прымае на сябе УСЕ рызыкі яго ажыццяўлення з моманту праектавання і да моманту перадачы гатовага аб'екта заказчыку (уключаючы выкананне гарантыйных абавязацельстваў), па якіх ён нясе фінансавую адказнасць перад заказчыкам. EPC-кантракт выкарыстоўваецца, як правіла, у тых праектах, дзе генаральны падрадчык можа з дастатковай ступенню дакладнасці ацаніць памер сваіх выдаткаў, а таксама ступень рызык. EPC-кантракт мае на ўвазе, што асноўны аб'ект работы EPC-падрадчык выконвае ўласнымі сіламі, таму не прадугледжваецца спецыяльнае ўзнагароджанне за арганізацыю і кіраванне работамі субпадрадчыкаў, што прыцягваюцца.*

— Вяртаючыся да неабходнасці развіцця комплекснага падыходу... Акрамя ўласна кадраў, якія выконваюць электрамантажныя наладачныя работы, мы маем у сваім саставе яшчэ і вытворчасць. Вытворчасць, якая абслугоўвае працэс электрамантажу. Гэта магутнасці, якія занятыя вырабам камплектуючых — кабельных канструкцый, панэляў кіравання, стэндаў датчыкаў, — працягвае дырэктар. — Тут бы я хацеў дадаць наступнае. Па маім асабістым перакананні, якая-небудзь эканоміка, краіна не можа хваліцца новымі тэхналогіямі, калі яна не ў стане на сучасным тэхналагічным узроўні займацца вырабам прасцейшых канструкцый. Напрыклад, за мяжой, у Германіі, па продажы новых аўтамабіляў мяркуюць пра стан эканомікі. А вось асабіста для сябе я выводжу такі крытэрый паказчыка эканомікі: як вы робіце, на якім узроўні металаканструкцыі, што выкарыстоўваюцца пераважна ў будаўніцтве. Такога ж тэхналагічнага ўзроўню будзе і ваша ўся прамысловасць. Гэта вельмі прэзентатыўна! І на сённяшні дзень на прадпрыемстве ўзяты курс на сур'ёзнае тэхналагічнае пераўзбраенне. Праца гэтая пачалася не ўчора і не пазаўчора. Упор мы робім на аўтаматычныя лініі, іншымі словамі, дзе ручная праца будзе зведзена фактычна толькі да загрузкі работнікам матэрыялу ў гэтую лінію і выгрузкі на другім яе канцы гатовых вырабаў. І зараз ва ўсю моц ідзе наладка такой лініі ў Бабруйску. Дагэтуль былі зманціраваныя і ўжо працуюць дзве аўтаматычныя лініі ў Гомелі, якія вырабляюць прадукцыю еўрапейскай якасці, што раней даводзілася набываць выключна за межамі краіны, бо ў Беларусі яна не выраблялася. А зараз вырабляецца — праўда, не на нашым прадпрыемстве. Пакуль. Канкурэнцыя?!. Я гатовы да барацьбы, заўсёды стаўлюся да канкурэнцыі філасофскі. Яна павінна быць, паколькі трымае цябе ў пастаянным тонусе.

Ад выпуску кабельных канструкцый я хацеў бы плаўна перайсці да атамнай станцыі, якую будуць у нас будаваць. На беларускай АЭС будуць выкарыстоўвацца кабельныя канструкцыі еўрапейскага тыпу, якія ўжо засвоены да вытворчасці ў нас і якія краіна ў стане сама вырабіць і паставіць на гэты аб'ект. І гэта трэба толькі вітаць. Мы атрымалі такі пасыл: каб праекціроўшчыкі ўсебакова разглядзелі гэтую сітуацыю. Справа ў тым, што для іншых АЭС праекціроўшчыкі праектуюць, распрацоўваюць кабельныя канструкцыі 40-гадовай даўніны, якія, натуральна, састарэлі і маральна, і фізічна...


Старшыня назіральнага савета, намеснік дырэктара па эканоміцы Мікалай ВЯЛІТЧАНКА.


Архіўныя здымкі нагадваюць пра дзейнасць брыгад ААТ «Электрацэнтрмантаж» на аб'ектах Беларусі і далёкага замежжа.

## АБ НАБАЛЕЛЫМ, АБ ПРАПАНОВАХ

...На жаль, падчас нашых сустрэч не абышлося без абмеркавання праблем. Здавалася б, у такога прадпрыемства іх, у прынцыпе, быць не павінна, а між тым... Адну з самых актуальных мы закранулі ў размове з дырэктарам Генадзем Вялітчанкам. Было відавочна, што менавіта яна найперш турбуе кіраўніка.

— Нарошчванне экспарту прынята адным з галоўных накірункаў развіцця эканомікі. Аднак часам для такіх прадпрыемстваў, якія экспартуюць паслугі, сітуацыя паварочваецца зваротным бокам, — разважаў Генадзь Мікалаевіч. — Экспартаваць паслугі — будаўнічыя, будаўніча-мантажныя — і каб прыбытак добры мець, і лагістычна, і тэхнічна цалкам рэальна — у тую ж Расію. А вось што датычыцца дальняга замежжа...

Як мяркуе суразмоўца, у нас папросту няма такіх кампаній. Тыя з сусветных, што прысутнічаюць на рынках, маюць у гэтым накірунку традыцыі. Аднак і падыходы ў іх іншыя.

— Яны не хочуць выкарыстоўваць нацыянальную працоўную сілу. Калі мы гаворым слова «нацыянальную», мы маем на ўвазе па краіне. Такія кампаніі выкарыстоўваюць і базіруюцца на працоўнай сіле, іншымі словамі, яны знаходзяць яе там, дзе размешчаны аб'ект, напрыклад, у Шры-Ланцы, Пакістане, Малайзіі, — патлумачыў Генадзь Мікалаевіч.

А калі ўжо загаварылі пра Расію, тут таксама нельга не абмовіцца хоць бы коратка пра яшчэ адзін нюанс. Там зараз літаральна катастрофа з працоўнымі кадрамі. Нафтавы рэсурс ёсць, грошы нафтавыя ёсць, вядома, што трэба зрабіць, але няма таго, хто дапамог бы. Пакаленне 1990-х гадоў выпала: цалкам перабудавалася не на вытворчасць, а на абслугоўванне нафтавых грошай. Калі, умоўна кажучы, стаіць каля нафтавага крана, а калі нават не стаіць, дык усё роўна як мінімум абслугоўвае таго, каму пашчасціла стаць каля таго нафтавага крана. Прынамсі, прыблізна такое меркаванне склалася ў суразмоўцы.

— Працуючы на той жа Смаленскай атамнай станцыі, мы бачылі, якія падыходы ў тамтэйшых мясцовых спецыялістаў. Мы бачылі, якія праектныя рашэнні ці не літаральна саракагадовай даўніны яны прапаноўвалі, бачылі арганізацыю іх працы. Мы так не працуем ужо гадоў 20-30. І калі нашы людзі з'яўляліся на станцыі ў мэтах выканання кантракта, літаральна на працягу двух тыдняў — а справа была ў канцы мінулага года — ім тут жа, кожнаму, быў прапанаваны персанальны кантракт ад расіян. Іншымі словамі, вялося самае натуральнае і відавочнае пераманьванне нашых работнікаў. І гэтая сітуацыя толькі пагаршаецца: мы сутыкнуліся з праблемай уцечкі кваліфікаваных кадраў у Расію, — расказаў нам дырэктар ААТ «Электрацэнтрмантаж». — Гэта пры тым, што, як вы ўжо ведаеце, заробак на нашым прадпрыемстве далёка не з самых маленькіх у галіне. Але ў Расіі плацяць яшчэ больш. Бяруць без аніякіх пытанняў. А калі яшчэ высвятляецца, што спецыяліст да гэтага працаваў менавіта ў «Электрацэнтрмантажы» — планка заработнай платы тут жа ўзнімаецца на максімальна магчымую вышыню...

Як можна вырашыць гэтыя пытанні? На думку Генадзя Мікалаевіча, павінен быць распрацаваны на заканадаўчым узроўні, прычым як мага хутчэй, шэраг мерапрыемстваў, звязаных з падаткаабкладаннем. У сферы экспарту паслуг, калі гаварыць коратка і па сутнасці, павінна быць перагледжаным у бок усялякага абкладання падаткамі тых сум валюты, якія ідуць у краіну.

## ПРА СТРУКТУРУ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Само прадпрыемства размяшчаецца ў Мінску, яно мае сем структурных падраздзяленняў з вытворчымі майстэрнямі са станочным абсталяваннем, грузападымальнымі механізмамі і аўтатэхнікай, якія, у сваю чаргу, базіруюцца ва ўсіх абласцях краіны.

Гэта: мантажнае падраздзяленне №1 (г. Мінск); мантажнае падраздзяленне №2 (г. Гродна, г. Белаазёрск); мантажнае падраздзяленне №3 (г. Гомель, г. Мазыр, г. Светлагорск); мантажнае №5 (г. Новалукомль, г. Наваполацк); мантажнае падраздзяленне №6 (п. Дружны); мантажнае падраздзяленне № 7 (г. Магілёў, г .Бабруйск); наладачнае падраздзяленне (г. Мінск). У 2006 годзе быў утвораны філіял ААТ «Электрацэнтрмантаж» на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. Асноўнай задачай філіяла з'яўляецца выкананне будаўніча-мантажных работ на тэрыторыі Расіі.

У Мінску прадпрыемства мае вытворча-комплексную базу плошчай 23 тысячы квадратных метраў, на якой размешчаны: цэх па вытворчасці ўсяго віду мантажных, электраўстановачных вырабаў, металаканструкцый, трубных загатовак; цэх па вытворчасці шчытавога абсталявання; аддзел галоўнага механіка з комплексам неабходнага зварачнага абсталявання, станочнага парка і сродкаў малой механізацыі для будаўнічых, электрамантажных і тэхналагічных работ; аўтагаспадарка з неабходнымі відамі аўтамашын, аўтакранавых установак, аўтавышак, экскаватараў, бульдозераў (як заўважыў потым **намеснік дырэктара па агульных пытаннях Яўген Іванавіч МЯДЗВЕДЗЕЎСКІХ,** аўтапарк за апошні час абноўлены на 75-80 працэнтаў).

...Мы хадзілі па тэрыторыі прадпрыемства і не пераставалі здзіўляцца. Па-першае, сам адміністрацыйна-вытворчы будынак ззяў знутры пасля свежага сучаснага рамонту. Як вядома, у многіх работнікаў — раз'язны характар працы, часта даводзіцца бываць у камандзіроўках (толькі за пражыванне работнікаў у гасцініцах прадпрыемства штомесяц выдаткоўвае, як удакладніў намеснік дырэктара па агульных пытаннях Яўген Мядзведзеўскіх, 180-200 мільёнаў рублёў (!), што таксама ўскосным чынам гаворыць пра маштабы такіх раз'ездаў). Дык вось, частку аднаго з паверхаў будынка пераабсталявалі пад своеасаблівыя гасцінічныя нумары, тут жа побач абсталявалі душавыя. Пагадзіцеся, такі клопат пра сваіх работнікаў дарагога каштуе, асабліва калі ўлічыць, што прадпрыемства знаходзіцца хоць быццам бы і побач з горадам, але ў прамзоне. Як кажуць, з усімі адпаведнымі наступствамі — няхай сабе нават толькі транспартнымі. Колькі ў чалавека на паездкі да гасцініцы ў сталіцу — туды-назад — часу зойме?.. А так і праца, і часовы дом — побач.

Для ўсіх ахвотных — пакой прыёму ежы з усёй новай і сучаснай бытавой тэхнікай (мікрахвалёўкай, халадзільнікам, электрачайнікам). У вялікім пакоі адпачынку — мяккія фатэлі і канапы, столікі, велізарны тэлевізар. Тут можна падчас абедзеннага перапынку паглядзець тэлеперадачу, згуляць у якую-небудзь настольную гульню. Калі шчыра, ці на многіх прадпрыемствах вам даводзілася бачыць такое?!.

Некаторыя будынкі вытворчых памяшканняў ужо паспелі змяніць фасады — на сучасныя, з сайдынгу, уцепленыя. І гэтая праца будзе падоўжана. Падчас гэтай нашай вытворчай экскурсіі па тэрыторыі мы, дарэчы, звярнулі ўвагу на яшчэ адзін — няхай, можа, і не галоўны, але — зноў жа прыклад гаспадарлівасці (пра што згадвалі на самым пачатку). Пацікавіліся ў нашага «гіда», **начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела Сяргея Мікалаевіча ЛУКЕРЧЫКА:** што, маўляў, за вагончыкі-бытоўкі бачым?

— Уласная прадукцыя. Калі ўзнікла праблема, вырашылі: навошта набываць, калі самі можам зрабіць — магчымасці, вытворчая база дазваляюць. Зараз іх на балансе прадпрыемства знаходзіцца недзе каля 70. Выпускаем пад уласныя патрэбы як офісныя — з ацяпленнем, з магчымасцю падключэння ўсіх патрэбных камунікацый для жыццядзейнасці работнікаў, — так і складскія, што не ацяпляюцца. Пры неабходнасці іх можна аператыўна «перакінуць» на любы аб'ект, — патлумачыў Сяргей Мікалаевіч.

## ПРА РЭКАНСТРУКЦЫЮ ЦЭХА МЕТАЛАКАНСТРУКЦЫЙ

— Вы б да нас лепш праз некалькі месяцаў якіх завіталі, тады б змены былі больш маштабнымі і відавочнымі, — ужо на самой тэрыторыі, нібы ў пацвярджэнне папярэдніх слоў дырэктара прадпрыемства пра планы адносна рэканструкцыі цэха металаканструкцый, — праводзіць своеасаблівую экскурсію загадчык **мантажна-нарыхтоўчага ўчастка Пётр ЮРЭНЯ.** Нам паказваюць, дзе будуць пракладзены шляхі, дзе будзе стаяць кран-балка на 10 тон (раней для пагрузкі-разгрузкі даводзілася ўвесь час аўтакран «ганяць»), дзе будзе разгружацца і як падавацца ў цэх да патрэбных станкоў метал, адкуль будуць выходзіць гатовыя вырабы — зноў жа праз кран-балку.

— На жаль, пакуль пры падвядзенні сетак рознай магутнасці нельга адмовіцца ад выкарыстання металаканструкцый — для іх падтрымкі, размеркавання на аб'ектах. Вось на гэтай пляцоўцы адбываецца іх частковая зборка, каб зэканоміць час на месцы будучага мантажу, у такім выглядзе яны накіроўваюцца на аб'ект, — паказвае нам працу работнікаў Сяргей Лукерчык.

У самім цэху заглядваем у аддзяленне для грунтавання і нанясення лакафарбавага пакрыцця, а таксама ў больш сучасную камеру парашковага напылення. Усяго тут працуе 46 чалавек: па два токары і маляры, восем электразваршчыкаў, астатнія работнікі — слесары.

— Калі я толькі прыйшоў сюды ў чэрвені 2009 года, наш цэх выробляў у месяц 25-30 тон металаканструкцый. Больш не атрымлівалася, — расказвае ўжо **інжынер-тэхнолаг мантажна-нарыхтоўчага ўчастка Валерый Максімавіч САМАХВАЛАЎ.** — А зараз... 16 снежня 2010 года мы атрымалі заказ на 250 тон металаканструкцый. І практычна заканчваем яго выконваць. Гэта значыць, што аб'ёмы павялічыліся ў тры-чатыры разы ў параўнанні з нядаўнім мінулым!

Дасягнуць гэтага атрымалася дзякуючы праведзенай частцы запланаваных работ па рэканструкцыі цэха. У прыватнасці, размяшчэнне абсталявання ў ім было ўпарадкавана. Падавалася б, што можа даць правільна пастаўлены станок — камбінаваныя нажніцы? Вельмі шмат, як высветлілася, бо ён, гаворачы тэхнічнай мовай, адразу трапляе ў цыкл. Раней швелеры секлі папярок цэха — гэта была вымушаная мера. Завозілі метал у цэх, круцілі, перашкаджалі ўсім, займалі кран-балку і секлі гэты метал. Зараз метал завозіцца, кладзецца на ральганг (у цэху ён універсальны — рэгулюецца і пад прамыя, і пад вуглавыя грузы), сячэцца і — далей, згодна з цыклам: у зварачнае аддзяленне або на афарбоўку, ці адразу на адгрузку. Замест трох чалавек гэтую працу (з металам да трох метраў па даўжыні) зараз можа выконваць адзін работнік.


Уладзімір САЎЧУК — адзін з самых вопытных электрамантажнікаў.


Пяцьдзясят тры гады працуе ў галіне энергетыкі Леанід ЗВАНЦОЎ, за гэты час ён прайшоў шлях ад мантажніка да пасады начальніка участка. Цяпер ветэран па-ранейшаму ў калектыве, кіруе службай аховы працы.


Складанае абсталяванне для апрацоўкі металу даручана вопытным рабочым токару Сяргею ВАСІЛЕЎСКАМУ і Аляксею НАТАЛЬЧУКУ.


Сакратар прыёмнай дырэктара Святлана АХРАМЕНКА заўжды ў курсе спраў.

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

28 красавіка
2011 г.
№ 15 (253)


# ГЕНЕРАЛЬНАЯ ПРЫБОРКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У Смалявіцкім раёне з наступленнем вясны па ініцыятыве мясцовай улады разгарнулася актыўная работа па навядзенні парадку на зямлі.**

Старшыню Жодзінскага сельскага Савета дэпутатаў Андрэя Бараўцова мы сустрэлі ў вёсцы Барсукі на цэнтральнай вуліцы. Завітаў ён сюды, каб яшчэ раз удакладніць аб'ёмы мяркуемых работ па добраўпарадкаванні тэрыторыі вёскі. Не паспелі разгаварыцца, як да нас падышлі дзве жанчыны — загадчыца мясцовага дзіцячага садка і яго супрацоўніца. Яны хацелі высветліць канчаткова, калі побач з іх установай будзе пастаўлена новая агароджа? Такая, як на супрацьлеглым баку вуліцы. Жанчыны пераконвалі старшыню ў тым, што агароджа вакол садка жыццёва неабходная: у дворык, дзе гуляюць дзеці, часам заходзяць куры, пеўні, забягаюць сабакі. Зразумела, за малымі пільна сочаць выхавацелькі, але ўсё ж за надзейнай агароджай ім было б спакайней.

Канкрэтна адказаць на гэта прамое пытанне Андрэю Мікалаевічу і проста, і складана адначасова. Проста, таму што ўсталяванне сучаснай і прыгожай агароджы агульнай даўжынёй тры кіламетры будзе абавязкова завершана. А складана, таму што вельмі многае залежыць не толькі ад жадання сельскага Савета, а яшчэ і ад наяўнасці сродкаў на яго рахунку. Як атрымалася з гэтай агароджай? Пра яе неабходнасць жыхары Барсукоў пры сустрэчы неаднойчы нагадвалі Андрэю Бараўцову. Калі аб'явілі тэндар на выраб агароджы, то аказалася, што свае, мясцовыя, смалявіцкія, вытворцы просяць шмат за сваю прадукцыю і паслугі. Больш выгадныя суадносіны цаны і якасці аказаліся ў барысаўчан. У іх і заказалі.

Між іншым, аб аўтарытэце Жодзінскага сельскага Савета гаворыць і той факт, што вытворцы бетонных секцый агароджы ўзяліся выконваць заказ без папярэдняй аплаты. Андрэй Мікалаевіч задаволены такім падыходам. І тым, што не зусім якасна зробленыя секцыі заменьваюцца без хітрыкаў і абяцанак-цацанак, па першым патрабаванні. Таму невыпадкова на гэтым прадпрыемстве сельскі Савет заказаў новую агароджу для двух вясковых могілак і яшчэ адной з вёсак. Барысаўчане разумеюць фінансавае становішча сельсавета, таму гатовыя працаваць з ім нават на ўмовах растэрміноўкі.

Магчыма, некаму такія мясцовыя клопаты здадуцца дробнымі. Але ўсё пазнаецца ў параўнанні. Калі ў Смалявічах больш разважаюць аб перспектывах і наступствах узвядзення на тэрыторыі раёна горада-спадарожніка, то для жыхароў Барсукоў узвядзенне новай, сучаснага выгляду агароджы стала ў пэўным сэнсе знакавай будоўляй. І яе сельвыканкам мяркуе давесці да лагічнага завяршэння. Як давялі той жа мясцовы «даўгабуд», напрыклад. З нагоды будаўніцтва новай школы ў Барсуках радаваліся двойчы. Першы раз — калі пачалі яе ўзводзіць. Другі — калі была пастаўлена кропка ў гэтай сумнай гісторыі. У пэўным сэнсе прыемнай навіной для жыхароў Барсукоў стаў продаж на аўкцыёне будынка недабудаванай школы. Гэты гмах з пустымі вокнамі і забруджаным дваром псаваў вонкавы выгляд вёскі. Выставілі пачатковую цану ў адну базавую велічыню, а прадалі прыкладна за 40 мільёнаў рублёў. Неблагія грошы за будынак, які ў свой час не быў правільна закансерваваны, шмат гадоў знаходзіўся пад уздзеяннем атмасферных ападкаў і ўжо аб'ектыўна не падыходзіў для выкарыстання ў якасці навучальнай установы. А цяпер у даўгабуда з'явіўся ўласнік-інвестар, які плануе распачаць тут перапрацоўку мясцовай сельгаспрадукцыі, наладзіць нейкую іншую вытворчасць, прывесці ў парадак навакольную тэрыторыю. Гэта значыць, што адкрыюцца і новыя працоўныя месцы.

Паводле слоў Андрэя Бараўцова, на тэрыторыі Савета ёсць яшчэ некалькі кінутых аб'ектаў, якіх знесці не так проста: трэба разбурыць і вывезці многія тоны разбітай цэглы і кавалкі бетону, добраўпарадкаваць вакол зямлю, а гэта запатрабуе значных выдаткаў. А вось прадаць па прымальнай для бізнэсу цане выгадна з усіх бакоў. Сёння мясцовыя ды і сталічныя прадпрымальнікі ўсё часцей распачынаюць на тэрыторыі раёна сваю справу, адкрываюць офісы фірмаў і прадпрыемстваў. Інтарэс зразумелы: тут больш выгадныя цэны на зямлю, арэнду памяшканняў ці іх набыццё пад вытворчасць. Гэтыя абставіны трэба выкарыстоўваць з выгадай для мясцовых жыхароў, лічыць Андрэй Мікалаевіч.

Дарэчы, Барсукі — адзін з 35 населеных пунктаў Жодзінскага сельсавета. На пасадзе старшыні Андрэй Бараўцоў працуе ўжо чацвёрты год, і за гэты час удалося шмат чаго зрабіць. Як кажа сам кіраўнік сельсавета, у многім дзякуючы падтрымцы раённага Савета і яго старшыні Аляксандра Ляхоўскага, якія надаюць вялікую ўвагу навядзенню парадку на зямлі.

Дзе бяруцца грошы на гэту справу? Сярод новых фінансавых крыніц Аляксандр Ляхоўскі называе аўкцыёны па продажы зямельных участкаў і непатрэбных будынкаў. Атрыманыя грошы могуць быць выкарыстаны для добраўпарадкавання населеных пунктаў. Такі досвед ужо ёсць. Летась, напрыклад, удала правялі аўкцыён у Азярыцка-Слабадскім сельсавеце, які мяжуе з Мінскім раёнам. Частку атрыманых сродкаў накіравалі на добраўпарадкаванне вёсак, а таксама на рамонт адміністрацыйнага будынка выканкама сельскага Савета.

ПРАШУ СЛОВА!

**Ірына НОВІКАВА, старшыня Шумілінскага раённага Савета дэпутатаў:**

# «ЗБЕРАЖЭШ КАПЕЙКУ — АТРЫМАЕШ РУБЕЛЬ»

**— На пярвічным узроўні ўлады, як вядома, працуе няшмат штатных работнікаў. Улічваючы гэтую акалічнасць, а таксама неабходнасць павышаць ролю органаў мясцовага самакіравання, мы вырашылі звярнуць асаблівую ўвагу на старэйшын, актывізаваць гэтую вялікую «армію».**

Яшчэ ў 2005 годзе была прынята сумесная пастанова аблвыканкама і аблсавета, дзе зацверджана Палажэнне аб старэйшыне сельскага населенага пункта, а таксама інструкцыя аб маральным і матэрыяльным стымуляванні іх працы. Пачынаючы з гэтага года, адпаведныя палажэнні і інструкцыі зацверджаны сесіямі ўсіх сельскіх Саветаў дэпутатаў. Што мы там прапісваем? Правы і абавязкі старэйшын, а таксама памеры выплат для іх — у залежнасці ад велічыні населенага пункта, колькасці двароў. Скажам, калі старэйшына працуе ў населеным пункце, дзе налічваецца да 20 двароў, ён атрымлівае адну базавую велічыню кожны квартал. Калі ў населеным пункце ад 21 да 50 двароў — гэта ўжо 1,5 базавая велічыні і гэтак далей. Старэйшыны маюць тыпавыя ламінаваныя пасведчанні, ім раздадзены пакеты нарматыўных дакументаў, якія маюць дачыненне да кампетэнцыі вясковых «мэраў».

Такая сістэмнасць датычыцца не толькі працы старэйшын. Па шэрагу кірункаў, ад якіх прама залежыць жыццезабеспячэнне людзей і якасць іх жыцця, у Віцебскай вобласці выпрацоўваюцца адзіныя падыходы. Узяць, напрыклад, перадачу сістэм цэнтралізаванага водазабеспячэння і водаадвядзення на баланс спецыялізаваных арганізацый — жылкамгаса. Але ж водазабеспячэнне — гэта яшчэ і шахтныя калодзежы, якіх у раёне налічваецца каля 1 400 і якія таксама неабходна перадаваць канкрэтнаму балансаўтрымальніку, каб ён адказваў за іх стан. У вобласці ўжо выпрацаваны адзіны падыход па перадачы грамадскіх калодзежаў з баланса сельвыканкама на баланс ЖКГ, ёсць канкрэтная інструкцыя, паводле якой мы працуем, і гэта вельмі спрашчае жыццё на месцах.

Пэўная сістэма з'явілася і падчас вырашэння пытання з перадачай дарог сельскіх населеных пунктаў. Перадаць іх спецыялізаванай арганізацыі — гэта толькі палова справы. А хто канкрэтна будзе займацца рамонтамі і добраўпарадкаваннем гэтых 138 кіламетраў і, галоўнае, за якія сродкі? Вырашылі стварыць на тэрыторыі кожнага сельсавета падраздзяленне ці ўчастак ЖКГ. У нас у раёне 8 сельсаветаў — і столькі ж створана падраздзяленняў, якім «нарэзаныя» адпаведныя задачы. А з мінулага года з'явілася і крыніца фінансавання гэтых вуліц. Сёлета, напрыклад, на іх утрыманне пойдзе 225 мільёнаў рублёў. Можа, і няшмат, але ж некалі ўвогуле не было нічога!

Каб дапамагчы сельвыканкамам больш эфектыўна рэалізоўваць на практыцы Указ № 70 (ён датычыцца зносу старых дамоў), быў падрыхтаваны пакет усіх неабходных дакументаў, уключаючы ўзоры іскавых заяў у суд... Пачынаючы з 2006 года, мы знеслі 692 дамы, затраціўшы на гэтыя мэты 235 мільёнаў рублёў, якія мэтанакіравана выдаткоўваюцца з абласнога бюджэту.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

ПЯРВІЧНЫ ЎЗРОВЕНЬ

# УМЕННЕ «ПРЫЦЯГВАЦЬ» ГРОШЫ

**У адрозненне ад многіх сваіх калег, старшыня Юркевіцкага сельскага Савета дэпутатаў Жыткавіцкага раёна Алена ШПАКЕВІЧ на праблему з агароджваннем грамадзянскіх могілак не скардзіцца — па той прычыне, што пытанне гэта даўно вырашана.**

— У той час як іншыя сельвыканкамы куплялі камп'ютары, мы расходавалі грошы на добраўпарадкаванне месцаў грамадзянскіх пахаванняў, — кажа Алена Іванаўна. — Шукалі спонсараў, уводзілі мясцовыя падаткі: тады, у 80—90-я, гэта яшчэ дазвалялася. Прычым агароджы рабілі не драўляныя, а бетонныя і металічныя, каб праслужылі доўга.

Затое цяпер усе могілкі на тэрыторыі сельсавета агароджаныя і добраўпарадкаваныя, а мясцовай уладзе не сорамна за іх стан ні перад жывымі, ні перад памерлымі. Як, дарэчы, і за стан населеных пунктаў.

— У нашых вёсках праблемы са смеццем існавалі заўсёды. Такое спрадвечнае балючае пытанне. Усе мае калегі ведаюць: як толькі замаячыць на даляглядзе чарговая камісія з праверкай — старшыня сельвыканкама або сакратар ідуць на тэрыторыю і збіраюць смецце, — расказвае Алена Шпакевіч. — У рэшце рэшт, нам гэта надакучыла. Вырашылі паставіць у буйных населеных пунктах невялікія сметніцы, як у горадзе. Але адна справа — вырашыць, і зусім іншая — рэалізаваць гэта на практыцы. Чамусьці гарадскім уладам дазваляецца праплочваць устаноўку сметніц з бюджэтных сродкаў, а сельвыканкамам — не... Давялося аж да Гомеля дайсці, да абласных фінансістаў, але пытанне мы вырашылі.

Паводле глыбокага пераканання Алены Шпакевіч, вырашэнне мясцовых праблем далёка не заўсёды «ўпіраецца» ў грошы.

— Мы працавалі і з грашыма, працавалі і без іх. На нашай тэрыторыі 8 населеных пунктаў, але няма і ніколі не было ні калгасаў, ні саўгасаў. Толькі адзін доследны рыбгас «Белае». Але, як той казаў, не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло. Такая сітуацыя прымусіла нас стварыць моцнае мясцовае самакіраванне. Калі на тэрыторыі сельсавета ёсць трывалы «фундамент» у выглядзе дэпутатаў і старастаў, дык і сельскаму Савету цікава працаваць, і грошы ў мясцовы бюджэт прыцягваюцца.

Да 2010 года ў Юркевіцкім сельсавеце не было ні дзіцячага садка, ні дзіцячай гульнявой пляцоўкі. Уявіць, як абыходзіліся маладыя бацькі без такой патрэбнай дашкольнай установы, дастаткова цяжка. Бацькі ішлі на працу, дзеці заставаліся без нагляду. Між тым, аўтамабільны рух у некаторых населеных пунктах сельсавета (пасёлак Азёрны, вёска Баравая) вельмі актыўны.

— Былі выпадкі, калі пакінутыя малыя выходзілі на праезную частку, і гэта заканчвалася вельмі сумна. А грошы на будаўніцтва садка раён усё ніяк не мог для нас выкраіць...

Але ў свеце, перакананая Алена Іванаўна, грошай хапае, проста трэба навучыцца іх знаходзіць і... прыцягваць.

— Мы праявілі ініцыятыву — вылучылі свае праекты па лініі ЕС/ПРААН. На іх там звярнулі ўвагу і выдаткавалі нам 21 мільён рублёў. Яшчэ 15 мільёнаў мы атрымалі з раённага бюджэту... Дзякуючы гэтым сродкам, а таксама неабыякавасці мясцовых арганізацый і насельніцтва ў лютым гэтага года нарэшце быў адкрыты дзіцячы садок.

Узводзіць для яго асобны будынак не прыйшлося, ды і грошай не хапіла б. Пад дзіцячую ўстанову пераабсталявалі два самыя светлыя і прыгожыя класы Юркевіцкай сярэдняй школы, прычым найбольш дарагімі па кошце аказаліся супрацьпажарныя металічныя дзверы і перагародка паміж пакоямі. Старшыня сельскага Савета асабіста займалася рэалізацыяй праекта, а па рахунках разлічваўся сельвыканкам... І ўсё ж наўрад ці праблему ўдалося б вырашыць так хутка, калі б не дапамога мясцовых актывістаў — старастаў, дэпутатаў і проста неабыякавых людзей.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

# ВЯСНОВЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ

**Для дэпутатаў абласнога і Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў становіцца ўжо традыцыяй — удзельнічаць у працы па добраўпарадкаванні тэрыторый.**

Папрацаваўшы ў Румлёўскім парку, дэпутаты разам са студэнтамі і мясцовымі жыхарамі пасадзілі больш за сто дрэў у абласным цэнтры — каля Дома ветэранаў па вуліцы Фамічова і ў мікрараёне «Дзевятоўка». Прычым некаторыя з удзельнікаў гэтай акцыі паабяцалі, што ў далейшым будуць асабіста даглядаць «свае» дрэвы.

Увогуле, у рамках «Тыдня лесу-2011» на Гродзеншчыне плануецца пасадзіць дрэў на плошчы больш за 3 тысячы гектараў. Акрамя таго, у лясах праводзіцца ачыстка ад сухастою і зваленых ветрам дрэў, якія нарыхтоўваюцца на дровы з адсартаваннем дзелавой драўніны. Для гэтай працы маецца ўсё неабходнае — інвентар, пасадачны матэрыял.

І яшчэ адзін вясновы прыярытэт, дзе праяўляюць ініцыятыву мясцовыя сельсаветы і старасты вёсак — добраўпарадкаванне могілак. Напрыклад, у Воранаўскім раёне правялі акцыю «Гэта трэба не мёртвым — гэта трэба жывым» па навядзенні парадку на могілках, у якой удзельнічалі навучэнцы Пеляскай, Больцішскай і Жырмунскай школ.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


**Несвижский районный исполнительный комитет 30 мая 2011г. в 11.00**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилого дома:**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Радзивилловская, 2, к/н 624250100001004364 | 0,1079 | Водоснабжение, электроснабжение, газоснабжение, канализация | 5000000 | 490000 |
| 2. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Радзивилловская, 4, к/н 624250100001004363 | 0,1069 | | 5000000 | 490000 |
| 3. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Радзивилловская, 6, к/н 624250100001004362 | 0,1058 | | 5000000 | 490000 |
| 4. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Радзивилловская, 8, к/н 624250100001004361 | 0,1197 | | 5000000 | 490000 |
| 5. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Шишигиной, 1 к/н 624250100001004357 | 0,1079 | | 5000000 | 490000 |
| 6. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Шишигиной, 3 к/н 624250100001004360 | 0,1072 | | 5000000 | 490000 |
| 7. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Шишигиной, 5 к/н 624250100001004359 | 0,1069 | | 5000000 | 490000 |
| 8. | Минская обл., г. Несвиж, ул. Шишигиной, 7 к/н 624250100001004358 | 0,0957 | | 5000000 | 490000 |

Условия для победителя аукциона: внесение в течение 10 рабочих дней со дня принятия Несвижским райисполкомом решения о предоставлении земельного участка платы за земельный участок, возмещение расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; осуществление в двухмесячный срок, после принятия решения о предоставлении земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок, получение в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятия (освоения) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации прав на него.

**Несвижский районный исполнительный комитет 30 мая 2011 г. в 11.00 проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка:**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Минская обл., Несвижский р-н, д. Козлы, назначение – для установки и обслуживания торгового павильона, кадастровый номер 624281303601000152, арендодатель – Несвижский районный исполнительный комитет | 0,0050 | обеспеченность (возможность подключения) электроснабжением, централизованным водоснабжением, наличие асфальтированного подъезда | 22700 | 2200 |
| 2. | Минская обл., г. Несвиж, назначение – для строительства туристического комплекса «Заозерье», кадастровый номер 624250100001004345, арендодатель – Несвижский районный исполнительный комитет | 5,3903 | обеспеченность (возможность подключения) электроснабжением, централизованным газоснабжением, централизованным водоснабжением, наличие асфальтированного подъезда | 48141754 | 4800000 |

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона, в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за предмет аукциона, возместить расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации; не позднее 2 рабочих дней после внесения платы за предмет аукциона, возмещения расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, заключить договор аренды земельного участка.

Кроме того, победитель аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для установки и обслуживания торгового павильона по ул. Центральной в д. Козлы Несвижского района возмещает убытки в сумме 21260 рублей, причиненному открытому акционерному обществу «Новая жизнь» изъятием земельного участка, потери сельскохозяйственного производства в сумме 196680 рублей, вызванные изъятием 0,0050 га сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства.

Также победитель аукциона на право заключения договора аренды земельного участка для строительства туристического комплекса «Заозерье» в г. Несвиже возмещает потери сельскохозяйственного производства в сумме 110 295 050 рублей, вызванные изъятием 2,0300 га сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства.

Задаток перечисляется в срок **по 27 мая 2011 г.** на **р/с 3642200070020 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 523, г. Несвиж, УНП 600038472**, получатель платежа – Несвижский районный исполнительный комитет.

Заявление на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** по адресу: **г. Несвиж, ул. Советская, 1, к. 221, тел. (8 01770) 55705. Последний день подачи заявок – 27 мая 2011 г. до 17.00.**



КУПАЛА VIENNA INSURANCE GROUP

Совместное белорусско-австрийское
Закрытое акционерное страховое общество «КУПАЛА»
тел. 200 80 27, GSM 682 80 27, 707 80 27, факс 2008013
220004, Минск, ул. Немига, 40
www.kupala.by e-mail: office@kupala.by

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС СБА ЗАСО «Купала» за 2010 год** тыс. руб.

| АКТИВ | СУММА | ПАССИВ | СУММА |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основные средства (по остаточной стоимости) | 2293967,9 | Уставный фонд | 5213800,1 |
| Нематериальные активы (по остаточной стоимости) | 26952,9 | Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | |
| Доходные вложения в материальные ценности (по остаточной стоимости) | | Резервный фонд | 212182,9 |
| | | Добавочный фонд | 1694484,3 |
| Вложения во внеоборотные активы | 646628,3 | Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 984879,8 |
| В том числе: незавершенное строительство | 646628,3 | Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 482469,8 |
| Прочие внеоборотные активы | | | |
| Запасы и затраты | 142186,6 | Целевое финансирование | |
| В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 111660,1 | Доходы будущих периодов | |
| | | Страховые резервы и фонды – всего | 6305347,7 |
| расходы будущих периодов | 30526,5 | В том числе: страховые резервы | 6052028,7 |
| прочие запасы и затраты | | | |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 896101,1 | фонды предупредительных (превентивных) мероприятий, гарантийные и иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 253319,0 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 175607,2 | | |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 1260713,6 | Долгосрочные кредиты и займы | 595890,0 |
| | | Прочие долгосрочные обязательства | |
| | | Краткосрочные кредиты и займы | |
| Расчеты с учредителями | | Кредиторская задолженность – всего | 502290,2 |
| В том числе: по вкладам в уставный фонд | | Задолженность перед участниками (учредителями) | |
| Денежные средства | 10133832,1 | | |
| Финансовые вложения | 415355,1 | Резервы предстоящих расходов | |
| Прочие оборотные активы | | Прочие краткосрочные обязательства | |
| **БАЛАНС** | **15991344,8** | **БАЛАНС** | **15991344,8** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ СБА ЗАСО «Купала» за 2010 год**

тыс. руб.

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ, ОТНОСЯЩЕМУСЯ К СТРАХОВАНИЮ ЖИЗНИ** | | |
| Страховые взносы (премии) полученные, брутто | 010 | |
| Страховые выплаты | 020 | |
| Изменение резервов по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или –) | 030 | |
| Отчисления в гарантийный фонд и фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 040 | |
| Расходы на ведение дела | 041 | |
| Прибыль (убыток) от операций по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или –) | 050 | |
| **II. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ ИНОМУ, ЧЕМ СТРАХОВАНИЕ ЖИЗНИ** | | |
| Страховые взносы (премии) с учетом перестрахования, нетто | 064 | 13686778,8 |
| Изменение резерва незаработанной премии с учетом перестрахования, нетто (+ или –) | 067 | 416202,1 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) с учетом перестрахования | 082 | 6972533,6 |
| Изменение резервов убытков (страховых выплат) с учетом перестрахования (+ или –), нетто | 092 | 62070,8 |
| Изменение других технических резервов (+ или –) | 100 | |
| Изменение иных страховых резервов (+ или –) | 105 | |
| Отчисления в фонды предупредительных мероприятий и гарантийные фонды | 110 | 154728,3 |
| Отчисления в иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 115 | |
| Расходы на ведение дела | 120 | 6247807,4 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 122 | 211188,1 |
| Поступления, связанные с реализацией перешедшего к страховщику права требования страхователя (выгодоприобретателя) к лицу, ответственному за убытки, возмещенные в результате страхования | 125 | 24187,4 |
| Прибыль (убыток) от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или –) | 130 | 1025357,9 |
| **III. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | |
| Операционные доходы | 140 | 917123,7 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 141 | 19534,2 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 150 | 897589,5 |
| Операционные расходы | 160 | 35551,4 |
| Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | 170 | 862038,1 |
| **IV. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | |
| Внереализационные доходы | 180 | 547499,7 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 181 | |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) | 190 | 547499,7 |
| Внереализационные расходы | 200 | 989083,9 |
| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | 210 | -441584,2 |
| Прибыль (убыток) | 220 | 1445811,8 |
| Налог на прибыль | 260 | 392240,7 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 270 | 67522,7 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 260 | 1168,6 |
| Чистая прибыль (убыток) | 270 | 984879,8 |

Аудитор – Общество с дополнительной ответственностью «ГлобалАудит», зарегистрированное решением Мингорисполкома от 22.09.2005 г. № 1708, полагает, что бухгалтерская отчетность СБА ЗАСО «Купала», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение СБА ЗАСО «Купала» на 01.01.2011 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2010 г., при этом совершенные СБА ЗАСО «Купала» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

